**Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме «Прыслоўе»**

**Мэты:** паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях тэмы, удасканальваць уменні адрозніваць прыслоўі ў тэксце, выяўляць іх сэнсава-граматычную ролю, паказаць ролю набытых ведаў пра прыслоўе ў практыцы маўленчых зносін;

садзейнічаць развіццю ўвагі, лагічнага мыслення, арфаграфічнай пільнасці, звязнага маўлення школьнікаў;

выхоўваць культуру разумовай працы, імкненне да ведаў, уменне працаваць індывідуальна, у групах і калектыўна;

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант**

Добры дзень, я вас вітаю,
Да заняткаў запрашаю.
Наш урок хай будзе плённым
І цікавым, і натхнёным.
Поспехаў я вам жадаю,
Калі што - я паспрыяю.

**II. Уступнае слова настаўніка**

На працягу многіх урокаў мы вывучалі тэму "Прыслоўе". Паўтаралі тое, што ведалі пра гэту часціну мовы, набывалі новыя веды, прымянялі іх на практыцы. Крок за крокам, паступова мы наблізіліся да сённяшняга ўрока, тэма якога гучыць так: "Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме "Прыслоўе" (запіс у сшытках).

*-Давайце разам з вамі сфармулюем мэту ўрока:*

-успомнім….
-замацуем….
-запомнім….

***Звернемся да эпіграфа.*** На якія якасці дадзенай часціны мовы ўказвае нам гэта загадка?

*Сваёй я формы не змяняю.*
*Заўсёды я абазначаю*
*Прымету дзеяння і стану,*
*Як з дзеясловам побач стану.*
*А як з прыметнікам – то гэта Ужо будзе якасці прымета.*

## III. Актуалізацыя ведаў

***I. Вусная размінка:***

1. Прыслоўе – гэта самастойная нязменная часціна мовы, якая…

2. Сэнсавыя разрады прыслоўяў: месца, часу, …

3. Ступені параўнання могуць утвараць прыслоўі, якія …

4. Прыслоўі ўтвараюцца …

5. Прэдыкатыўныя прыслоўі – гэта …

6. Прыслоўі ў сказе могуць выконваць сінтаксічную ролю …

7. Прыслоўі могуць утварацца наступнымі спосабамі: …

8. Прыслоўі пішуцца …

9. Як адрозніць прыслоўі з прыстаўкамі ад назоўнікаў з прыназоўнікамі?

**II. Тэст-лата**

*На слайдах з’яўляюцца пытанні, задача школьнікаў – выбраць правільны адказ.*

Праверка (адказы на слайдзе)

*- З якімі цяжкасцямі вы сутыкнуліся?*

## IV. Замацаванне матэрыялу

**I. Групавая работа**

*На экране з’яўляецца тэкст **“Любоў да радзімы”** (ён жа раздаецца кожнаму вучню на парту)*

Любоў да радзімы ў чалавека праяўляецца тады, калі ён на час разлучыцца з ёю. І чым даўжэй ён будзе недзе далёка, тым мацней гэтае пачуццё. Але чалавек здольны хаваць свае пачуцці. А вось у птушак гэта навідавоку.

Возьмем усім нам знаёмых жораваў. На радзіме яны, апрача глухога балота, нічога, бадай, не бачаць. У далёкіх жа краях птушак чакае багаты корм, залітыя паўднёвым сонцам берагі маляўнічых рэк і азёр. І ўсё ж, нягледзячы на гэта, восенню пакідаюць жоравы радзіму неахвотна. Пралятаючы над вёскамі, яны падаюць свае сумныя галасы, бо цяжка з роднай зямлёй развітвацца.

Неахвотна пакідаюць родную зямлю не адны толькі жоравы. Гэта ўласціва ўсім птушкам. Вясной гракі з'яўляюцца ў нас з першымі праталінамі ў палях. Аднак пакідаюць яны родную

зямлю толькі позняй восенню. Позна адлятаюць качкі, а пры зручным выпадку і зусім застаюцца зімаваць.

Родная зямля! Што можа быць даражэй за яе?

- *Чаму нашу Беларусь называюць зямлёй пад белымі крыламі?*
- *Як адчуваюць сябе буслы на Радзіме?*
- *А вы?*

**Заданне 1 групе:** 1) выпісаць з тэксту прыслоўі;
2) вызначыць разрады прыслоўяў.

**Заданне 2 групе:** 1) зрабіць марфалагічны разбор 2 прыслоўяў (на выбар).

**Заданне 3 групе:** 1) выпісаць прыслоўі, якія стаяць у пэўнай ступені параўнання, вызначыць гэтую ступень і форму.

### V. Фізкультхвілінка

Устаньце, беларусы, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца падцягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,
Вераценцам пакруціцеся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І на месца ціха сядзьце.

### II. Лексічная работа

- *Наша зямля багата на фальклор, і таму зараз мы звернемся да яго. Работа з загадкамі.*

1. Зімой расце коранем угору, а вясной памірае — хто адгадае? ***(ледзяшы)***

2. Дзе ўначы гарэлі зоры —
Разлілося ранкам мора.
А ў блакітным моры лодка
Адплывае ў край далёкі. **(Воблака)**

3. Хто на месцы не сядзіць,
Разам з ветрыкам ляціць?
Жвава кружацца пушынкі,
Гэта белыя … **(сняжынкі)**

4. Улетку адпачываюць,
А ўзімку дзяцей катаюць. **(санкі)**

5. Удзень шкло разбіта, а нанач устаўлена. **(лёд)**

*Школьнікі знаходзяць у загадках прыслоўі, вызначаюць іх разрад і разбіраюць па саставу.*

**III. Работа на картках**

*Асобныя вучні атрымліваюць картку з параўнальным зваротам. Задача школьнікаў – замяніць яго прыслоўем.*

1) Свістаць, як салавей (па-салаўінаму)
2) Смяяцца, як дзіця (па-дзіцячы)
3) Змагацца, як герой (па-геройску)
4) Клапаціцца, як бацька (па-бацькоўску)
5) Выць, як воўк (па-воўчы)
6) Хай будзе, як вы сказалі (па-вашаму)
7) Гаварыць на беларускай мове (па-беларуску)
8) Прыбрацца, як у свята (па-святочнаму)

**IV. Групавая работа (па радах)**

| Разам | Асобна | Праз дэфіс |
|---|---|---|
| спачатку | на памяць | па-новаму |
| узімку | у адзіночку | па-чалавечы |
| справа | усё роўна | па-першае |
| удвух | дзень у дзень | абы-дзе |
| напрыклад | з ранку да вечара | абы-куды |
| угору | | там-сям |
| уверх | | як-небудзь |

1 рад – запісваюць прыслоўі, якія пішуцца праз дэфіс
2 рад - запісваюць прыслоўі, якія пішуцца разам
3 рад - запісваюць прыслоўі, якія пішуцца асобна

**VI. Падвядзенне вынікаў**

***Выніковы тэст***

***1. Прыслоўе – гэта..***
а) службовая часціна мовы;
б) форма дзеяслова;
в) самастойная часціна мовы.

***2. Знайдзіце прыслоўі спосабу дзеяння:***
а) унізе;
б) сумна;
в) учора.

***3. Адзначце прыслоўе, якое пішацца праз злучок:***
а) ледзь(ледзь);
б) (на)памяць;
в) (на)што.

***4. Адзначце памылковую форму ступені параўнання прыслоўяў:***

а) смялей;
б) больш смела;
в) больш смялей;
г) сама смела.

***5. Вызначыць, якую ролю выконвае прыслоўе ў сказе:***
*Гудуць* ***несціхана*** *на торфе турбіны.*
а) азначэнне;
б) акалічнасць;
в) дапаўненне.

**Ключ: 1.в, 2б, 3а, 4в,5б.**

## VII. Выстаўленне і каменціраванне адзнак

## VIII. Рэфлексія

## IX. Дамашняе заданне

Творчае заданне: напісаць сачыненне на адну з тэм: «Кветкі маёй роднай зямлі», «Мая малая Радзіма»